**СРОДКІ ВЫРАЖЭННЯ СІНТАКСІЧНАЙ СУВЯЗІ** – разнастайныя адзінкі розных узроўняў моўнай сістэмы, якія выкарыстоўваюцца для фармальнага выражэння адносін паміж сінтаксічнымі адзінкамі або іх кампаненетамі. Да сродкаў выражэння сінтаксічнай сувязі адзносяць:

**канчаткі** звязваюць нераўназначныя кампаненты словазлучэнняў (*мой бацька*, *убачыць сябра*), дзейнік і выказнік (*Спявалі птушкі*), непасрэдна выражаючы граматычныя значэнні сінтаксічных адзінак;

**прыназоўнікі** разам з канчаткамі звязваюць нераўназначныя кампаненты словазлучэнняў, выражаюць пэўныя сінтаксічныя адносіны (*злезці з печы*, *ішоў з дзедам*, *пачалося з раніцы*);

**злучнікі**, **займеннікі**, **прыслоўі**, **часціцы** звязваюць раўназначныя кампаненты словазлучэнняў (блізка і далёка), раўназначныя і нераўназначныя часткі складаных сказаў: *Набліжаўся Новы год, а снегу ўсё яшчэ не было* (Я. Сіпакоў); *Усё пра птушак, што жывуць побач з людзьмі, добра вывучана чалавекам да самых драбніц* (Р. Ігнаценка); *За хвоечкамі, дзе крута абрываўся бераг, цякла і рабіла свой заварот плыценькая рэчка* (В. Адамчык); *Настаўнік спытаў, ці прынеслі вучні кнігі*;

**парадак слоў** і **інтанацыя** з'яўляюцца дапаможнымі сродкамі выражэння сінтаксічнай сувязі пры наяўнасці канчаткаў і злучнікаў, а таксама могуць быць асноўнымі сродкамі сувязі пры адсутнасці іншых, напрыклад, пры размежаванні членаў і тыпаў сказа: *Моладзь – наша будучыня*; *Маці шукае дзіця*; *Туманны лес*; *Лес туманны* (гл. **ПАРАДАК СЛОЎ, ІНТАНАЦЫЯ**).

*М.С.Ржавуцкая*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ